МИНСКИЙ ОБЛИСПОЛКОМ
КЛЕЦКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 690532545
10.11.2022 [подпись]
дата подпись
Дашкевич Э.В.
фамилия, инициалы

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Клецкага раённага
выканаўчага камітэта
31.10.2022 № 1197

# СТАТУТ
Дзяржаўнай установы адукацыі
“Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна”
(Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна)
(новая рэдакцыя)

# УСТАВ
Государственного учреждения образования
«Синявская средняя школа Клецкого района»
(Синявская средняя школа Клецкого района)
(новая редакция)

Клецкі раён
2022

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзены Статут з’яўляецца новай рэдакцыяй Статута Дзяржаўнай установы адукацыі “Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна”, які 29.10.2020 зарэгістраваны ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за рэгістрацыйным нумарам 690332545 на падставе рашэння Клецкага раённага выканаўчага камітэта ад 27.10.2020 № 1475 і страчвае сваю сілу з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенага Статута.

Статут зацверджаны ў новай рэдакцыі ў сувязі з унясеннем змен і дапаўненняў для прывядзення Статута ў адпаведнасць з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Сіняўская сярэдняя школа заснавана ў 1869 годзе.

Установа адукацыі “Сіняўская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа Клецкага раёна” створана на базе Сіняўскай сярэдняй школы рашэннем Клецкага раённага выканаўчага камітэта ад 04.04.2005г. № 245 і зарэгістравана рашэннем Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 19.04.2005 № 336.

Рашэннем Клецкага раённага выканаўчага камітэта ад 19.09.2011 № 1337 установа адукацыі “Сіняўская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа Клецкага раёна” перайменавана ў Дзяржаўную ўстанову адукацыі “Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна” (далей – Установа адукацыі). Змяненні зарэгістраваны Клецкім раённым выканаўчым камітэтам 21.09.2011.

2.Заснавальнікам, уласнікам Установы адукацыі і ўласнікам маёмасці з’яўляецца Клецкі раённы выканаўчы камітэт.

Органам дзяржаўнага кіравання, упаўнаважаным уласнікам кіраваць маёмасцю Установы адукацыі, з’яўляецца ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта, кампетэнцыі якога прадугледжаны Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі заканадаўчымі актамі.

3. Кампетэнцыі заснавальніка Установы адукацыі:

3.1. прымае рашэнне аб змяненні віда, аб рэарганізацыі, ліквідацыі Установы ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам;

3.2. у выпадку рэарганізацыі, ліквідацыі Установы адукацыі, ануліравання, спынення дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на адукацыйную дзейнасць Установы адукацыі прымае меры па пераводзе навучэнцаў з іх згоды, згоды законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам;

3.3. прымае рашэнне аб напаўняльнасці класаў, групы падоўжанага дня, зацвярджае кантрольныя лічбы прыёму для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі;

3.4. вызначае мову навучання і выхавання, абавязковую для вывучэння замежную мову ў адпаведнасці з заканадаўствам;

3.5. фарміруе матэрыяльна-тэхнічную базу Установы адукацыі, забяспечвае яе абнаўленне і развіццё;

3.6. узгадняе ўнясенне зменаў і дапаўненняў у структуру і штатны расклад Установы адукацыі;

3.7. ажыццяўляе іншыя правы і абавязкі, прадугледжаныя актамі заканадаўства і дадзеным Статутам.

4. Установа адукацыі створана ў форме ўстановы на аснове дзяржаўнай уласнасці, з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая фінансуецца з мясцовага бюджэту.

5. Установа адукацыі ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, Статутам Установы адукацыі.

Установа адукацыі з'яўляецца дзяржаўнай установай адукацыі, дзейнасць якой накіравана на духоўна-маральнае і фізічнае развіццё асобы навучэнца, яго індывідуальных здольнасцей; авалодванне навучэнцамі асновамі навук, дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, навыкамі разумовай і фізічнай працы, самастойнай вучэбнай дзейнасці, неабходнымі для падрыхтоўкі для жыцця ў грамадстве, самастойнага жыццёвага выбару; развіццё інтарэсу да пазнання і творчых здольнасцей, здольнасцей да сацыяльнага самавызначэння, фарміраванне маральных перакананняў, культуры паводзін і зносін, эстэтычнага густу, бяспечнага і здаровага ладу жыцця, кампетэнцый, накіраваных на падрыхтоўку да працягу адукацыі і пачатку працоўнай дзейнасці.

6. Установа адукацыі з'яўляецца юрыдычнай асобай, якая мае ў аператыўным кіраванні адасобленую частку дзяржаўнай уласнасці, нясе самастойна адказнасць па сваіх абавязацельствах, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і немаёмасныя правы, выконваць абавязацельствы, быць істцом і адказчыкам у судзе.

7. Установа адукацыі мае пячатку з адлюстраваннем Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, штамп са сваёй назвай, можа мець разліковы і іншыя рахункі ў банках Рэспублікі Беларусь.

8. Тып Установы адукацыі – установа агульнай сярэдняй адукацыі, від – сярэдняя школа.

9. Поўная назва Установы адукацыі:

на беларускай мове – Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна";

на рускай мове – Государственное учреждение образования “Синявская средняя школа Клецкого района”.

Скарочаная назва Установы адукацыі:

на беларускай мове – Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна;

на рускай мове – Синявская средняя школа Клецкого района.

10. Месца знаходжання Установы адукацыі: 222652, Рэспубліка Беларусь, Мінская вобласць, Клецкі раён, аг. Сіняўка, вул. Школьная, д. 12.

11. Дакументацыя Установы адукацыі вядзецца на беларускай мове ў адпаведнасці з інструкцыяй па справаводстве.

Справаздачнасць Установы адукацыі падаецца ва ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта ў адпаведнасці з патрабаваннямі органаў дзяржаўнай статыстыкі Рэспублікі Беларусь.

12. Ва Установе адукацыі не дапускаецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія праследуюць палітычныя мэты, а таксама стварэнне і ананімная або іншая супярэчная заканадаўству дзейнасць рэлігійных арганізацый.

13. Установа адукацыі ў пытаннях выхавання на падставе пісьмовых заяў навучэнцаў (законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў) у пазаўрочны час можа ўзаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

14. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

15. Змяненні і (або) дапаўненні ў Статут Установы адукацыі ўносяцца пасля іх зацвярджэння заснавальнікам у парадку, устаноўленым дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

16. Дзейнасць Установы адукацыі заснавана на прынцыпах:

16.1. прыярытэту адукацыі;

16.2. прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, правоў чалавека, гуманітычнага характару адукацыі;

16.3. гарантыі канстытуцыйнага права кожнага на адукацыю, духоўнае, маральнае і фізічнае развіццё;

16.4. інклюзіі ў адукацыі, якая забяспечвае аднолькавы доступ да атрымання адукацыі для ўсіх навучэнцаў з улікам разнастайнасці

асобых індывідуальных адукацыйных запатрабаванняў і індывідуальных магчымасцей кожнага навучэнца;

16.5. абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі.

17. Прадметам дзейнасці Установы адукацыі з'яўляецца ажыццяўляемая ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адукацыйная дзейнасць, якая ўключае ў сябе арганізацыю і правядзенне вучэбнай, выхаваўчай і метадычнай работы.

18. Асноўнай мэтай дзейнасці Установы адукацыі з'яўляецца рэалізацыя дзяржаўных адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі, фарміраванне адукаванай, сацыяльна, духоўна і маральна сталай, творчай асобы, выхаванне грамадзяніна і патрыёта Рэспублікі Беларусь, павагі правоў і свабод чалавека, любові да Радзімы, сям'і, прыняцце навыкаў здаровага ладу жыцця.

19. Асноўнымі задачамі Установы адукацыі з'яўляюцца:

забеспячэнне атрымання навучэнцамі агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі; спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

развіццё асобы навучэнцаў, развіццё іх здольнасцей і схільнасцей, фарміраванне навуковага светапогляду;

фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі;

падрыхтоўка навучэнцаў да свядомага прафесійнага самавызначэння, працягу адукацыі, працоўнай і грамадскай дзейнасці, сямейнага жыцця;

фарміраванне маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры;

авалодванне каштоўнасцямі і навыкамі здаровага ладу жыцця;

правядзенне метадычнай работы, накіраванай на ўдасканаленне адукацыйнага працэсу.

20. Установа адукацыі ажыццяўляе віды эканамічнай дзейнасці ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь "Віды эканамічнай дзейнасці" АКРБ 005-2011, якія зацверджаны пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 05.12.2011 № 85 (са зменамі і дапаўненнямі).

21. Віды дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, ажыццяўляюцца Установай адукацыі пасля атрымання ліцэнзіі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

# ГЛАВА 3
# АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ВА УСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ

22. Адукацыйны працэс ва Установе адукацыі арганізуецца на аснове:

22.1. прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

22.2. адукацыйных стандартаў;

22.3. дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, якія рэалізуюцца ў галінах эканомікі і сацыяльнай сферы інавацыйных праектаў;

22.4. педагагічна абгрунтаванага выбару формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

22.5. культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

22.6. сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій.

23. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і ўключае ў сябе тэарэтычную і практычную падрыхтоўку, выхаваўчую работу, самастойную работу навучэнцаў, атэстацыю навучэнцаў у выпадках, прадугледжаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншых нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

24. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу:

24.1. забеспячэнне якасці адукацыі;

24.2. кампетэнтнасны падыход;

24.3. ахова жыцця і здароўя навучэнцаў;

24.4. захаванне ўстаноўленай працягласці навучальнага года і канікул, тэрмінаў і формаў атэстацыі навучэнцаў;

24.5. выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

24.6. стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку пры правядзенні мерапрыемстваў плана выхаваўчай работы Установы адукацыі. Патрабаванні да мер бяспекі пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

24.7. стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў, прыцягненне іх да розных відаў сацыяльна-значнай дзейнасці;

24.8. забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі;

24.9. педагагічная падтрымка дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў;

24.10. стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

25. Навучанне ва Установе адукацыі ажыццяўляецца на беларускай мове.

Вывучэнне беларускай, рускай і адной замежнай мовы ва Установе адукацыі з’яўляецца абавязковым.

26. Парадак вывучэння беларускай мовы замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова прабываюць або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

27. Абавязковая для вывучэння замежная мова ва Установе адукацыі – англійская, за выключэннем асобных катэгорый дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

У адпаведнасці з Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі для працягу вывучэння вучнямі V – IX класаў раней вывучаемай замежнай мовы, якая не вывучаецца ва Установе адукацыі, пры наяўнасці ў кожным класе ад аднаго да пяці вучняў выдзяляецца не менш за 3 гадзіны ў тыдзень на клас, X – XI класы – не менш за 2 гадзіны ў тыдзень на клас.

28. Установа адукацыі рэалізуе:

28.1. адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі);

28.2. адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю;

28.3. адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для вучняў X – XI класаў;

28.4. праграму бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнцкай моладзі;

28.5. праграму выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы;

28.6. адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

29. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі можа быць арганізаваны:

29.1. ва Установе адукацыі;

29.2. дома.

30. Установа адукацыі функцыяніруе ў складзе I–XI класаў, ажыццяўляючы навучанне і выхаванне на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі (I ступень – I–IV класы, II ступень – V–IX класы, III ступень – X–XI класы).

31. I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць агульную базавую адукацыю. Агульная базавая адукацыя дае права на працяг адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

32. I, II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць агульную сярэднюю адукацыю. Агульная сярэдняя адукацыя дае права на працяг адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

33. Патрабаванне абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі захоўваецца да дасягнення асобай узросту васямнаццаці гадоў, а таксама для асоб, якія дасягнулі такога ўзросту і засвойваюць змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі. Пры гэтым патрабаванне абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі не распаўсюджваецца на асоб, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

34. Тэрміны навучання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складаюць на:

I ступені пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі – чатыры гады;

II ступені пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі – пяць гадоў;

III ступені пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі – два гады.

35. Форма атрымання адукацыі ва Установе адукацыі – дзённая вочная. Пры неабходнасці адукацыя можа быць атрымана ў дыстанцыйнай форме.

36. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца па навучальных гадах. Навучальны год дзеліцца на чвэрці.

Працягласць навучальнага года, уключаючы канікулы, устанаўліваецца з 1 верасня па 31 жніўня. Вучэбныя заняткі праводзяцца з 1 верасня па 31 мая ўключна, а для вучняў IX і XI класаў – з 1 верасня па 25 мая. Калі ўказаныя даты прыходзяцца на нерабочы дзень, то пачатак (завяршэнне) навучальнага года, вучэбных заняткаў пераносіцца на наступны (папярэдні) рабочы дзень.

37. Для навучэнцаў устанаўліваюцца канікулы.

Агульная працягласць канікул у перыяд правядзення вучэбных заняткаў павінна быць не менш за 30 каляндарных дзён, для навучэнцаў I і II класаў (III класа – для вучняў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з пяцігадовым тэрмінам навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі) не менш за 37 каляндарных дзён.

Працягласць летніх канікул павінна быць не менш за 12 каляндарных тыдняў. Для навучэнцаў, якія завяршылі навучанне і выхаванне ў IX класе на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, працягласць летніх канікул павінна быць не менш за 10 каляндарных тыдняў.

38. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя мерапрыемствы, а таксама выхаваўчая работа з навучэнцамі ў пазаўрочны час арганізуецца ў рэжыме шасцідзённага тыдня, уключаючы пяцідзённы вучэбны тыдзень і шосты школьны дзень. Вучэбныя заняткі, факультатыўныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі праводзяцца ў рэжыме пяцідзённага вучэбнага тыдня. Вучэбныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйныя праграмы сярэдняй адукацыі праводзяцца ў рэжыме пяцідзённага вучэбнага тыдня. У рэжыме шасцідзённага тыдня могуць праводзіцца факультатыўныя заняткі ў V – XI класах і рэалізоўвацца адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для навучэнцаў X – XI класаў. У шосты школьны дзень праводзяцца мерапрыемствы па рэалізацыі асноўных напрамкаў выхавання, у тым ліку спартыўна-масавыя, турыстычныя мерапрыемствы, экскурсіі.

39. Працягласць урока ў І-ым класе – 35 хвілін, у II – XI класах – 45 хвілін.

Штодзённая колькасць вучэбных заняткаў вызначаецца раскладам заняткаў, які зацвярджаецца дырэктарам Установы адукацыі.

40. Вывучэнне вучэбных прадметаў, модуляў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на базавым узроўні.

Базавы ўзровень вывучэння вучэбнага прадмета, модуля – вывучэнне зместу адпаведнага вучэбнага прадмета, які з'яўляецца абавязковым пры засваенні вучэбнай праграмы па дадзеным вучэбным прадмеце, модулі.

41. На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі прадстаўляецца магчымасць ажыццяўляць профільнае навучанне, якое спалучае вывучэнне вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні і правядзенне факультатыўных заняткаў прафесійнай накіраванасці для арыентацыі на атрыманне педагагічных, аграрных і іншых спецыяльнасцей.

42. Прыём (залічэнне) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным ўзроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

43. Вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні арганізуецца ў рэжыме пяцідзённага тыдня, а вывучэнне прафесійна арыентаваных факультатыўных заняткаў ажыццяўляецца ў шосты школьны дзень.

44. Профільнаму навучанню на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі папярэднічае дапрофільная падрыхтоўка навучэнцаў.

Дапрофільная падрыхтоўка і прафарыентацыйная работа з’яўляюцца абавязковым падрыхтоўчым этапам прафілізацыі.

45. На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні з V класа можа вывучацца вучэбны прадмет “Замежная мова”, а з VIII класа – любы вучэбны прадмет, модуль (любыя вучэбныя прадметы, модулі) з ліку вучэбных прадметаў, вызначаных тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі для абавязковага вывучэння.

46. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца вучэбны занятак: урок, назіранне, экскурсія, вучэбна-палявыя зборы і іншыя вучэбныя заняткі. Дадаткова праводзяцца факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, практычныя заняткі, грамадска карысная праца, карэкцыйныя заняткі (для вучняў з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця).

Факультатыўныя заняткі могуць быць прыродазнаўча-матэматычнай, гуманітарнай, грамадазнаўчай, экалагічнай, ваенна-патрыятычнай, музычнай, харэаграфічнай, мастацкай, тэатральнай, спартыўнай, прафарыентацыйнай і іншай накіраванасці, а таксама могуць садзейнічаць фізічнаму развіццю навучэнцаў, удасканальванню іх рухальнай актыўнасці.

Стымулюючыя заняткі – заняткі, накіраваныя на развіццё творчых здольнасцей адораных і таленавітых навучэнцаў.

Падтрымліваючыя заняткі – заняткі, накіраваныя на пераадольванне цяжкасцей у вывучэнні вучэбных прадметаў (асобных тэм вучэбных прадметаў) навучэнцамі, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыю ў вочнай форме атрымання адукацыі.

Грамадска карысная праца – заняткі, накіраваныя на фарміраванне ў навучэнцаў працоўных уменняў і навыкаў.

47. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў класах, у тым ліку і класах інтэграванага навучання і выхавання, і індывідуальна.

Класы інтэграванага навучання і выхавання – класы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы

спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасць, і асобы, якія не маюць такіх асаблівасцей і засвойваюць змест адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

48. Рашэнне аб напаўняльнасці класаў прымаецца заснавальнікам Установы адукацыі. Напаўняльнасць класаў інтэграванага навучання і выхавання вызначаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да напаўняльнасці класаў, устаноўленымі пунктам 15 артыкула 273 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Класы могуць дзяліцца на групы ў выпадках і парадку, якія вызначаюцца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

49. Адукацыйны працэс арганізуецца індывідуальна ў выпадках, калі гэта прадугледжана вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама на падставе рашэння дырэктара Установы адукацыі ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам.

Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу індывідуальна вызначаецца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

50. Для навучэнцаў, якія па медыцынскіх паказаннях часова або пастаянна не могуць наведваць Установу адукацыі, ствараюцца ўмовы для засваення зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі дома.

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб засваенні зместу адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі дома прымаецца ўпраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта на падставе заявы навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

51. З мэтай сацыялізацыі навучэнца, які засвойвае змест адпаведнай адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі дома, вучэбныя заняткі могуць арганізоўвацца дома ці ў спалучэнні вучэбных заняткаў дома і ва Установе адукацыі.

52. Для аказання дапамогі сям'і ў навучанні і выхаванні навучэнцаў, стварэння ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў ва Установе адукацыі могуць адкрывацца групы падоўжанага дня для навучэнцаў I – IX класаў, палажэнне аб якіх зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

53. Прыём (залічэнне) асобы для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі ажыццяўляецца па дасягненні асобай на пачатак навучальнага года ўзросту шасці гадоў ці па жаданні аднаго

з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы з больш позняга ўзросту. Па заяве аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы пры наяўнасці рашэння педагагічнага савета дапускаецца прыём (залічэнне) у I клас асобы, якой шэсць гадоў спаўняецца ў бягучым каляндарным годзе.

Першачарговае права пры прыёме (залічэнні) ва Установу адукацыі маюць асобы, якія пражываюць на тэрыторыі, за якой замацавана Установа адукацыі. Пры наяўнасці свабодных месцаў ва Установу адукацыі могуць прымацца (залічвацца) асобы назалежна ад месца іх жыхарства. Тэрмін і парадак прыёму (залічэння) ва Установу адукацыі на свабодныя месцы асоб, якія не пражываюць на тэрыторыі, за якой замацавана Установа адукацыі, вызначаюцца Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

54. Прыём (залічэнне) асобы, дасягнуўшай узросту чатырнаццаці гадоў, ва Установу адукацыі для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на падставе яго заявы і са згоды аднаго з яго законных прадстаўнікоў пры прад'яўленні пасведчання аб нараджэнні ці дакумента, які пацвярджае асобу, медыцынскай даведкі аб стане здароўя, даведкі аб навучанні. Ад імя непаўналетняй асобы заява можа быць пададзена яе законным прадстаўніком.

55. Навучэнцы пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, за выключэннем экстэрнаў, праходзяць бягучую, прамежкавую і выніковую атэстацыю па вучэбных прадметах, модулях вучэбнага плана Установы адукацыі.

Пры правядзенні прамежкавай і выніковай атэстацыі ажыццяўляецца ацэнка паводзін навучэнцаў, якая выражаецца наступнымі характарыстыкамі: "прыкладныя", "здавальняючыя", "нездавальняючыя". Крытэрыі ацэнкі паводзін навучэнцаў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

56. Рэзультаты бягучай і прамежкавай атэстацыі навучэнцаў заносяцца ў класны журнал і дзённік навучэнца. Тыпавыя формы класнага журнала, дзённіка навучэнца і парадак іх вядзення вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

57. Атэстацыя, перавод, арганізацыя выпускных іспытаў і выпуск навучэнцаў ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

58. Атэстацыя навучэнцаў праводзіцца ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Правіламі вызначаны парадак правядзення бягучай, прамежкавай, выніковай атэстацыі, у тым ліку віды выніковай атэстацыі, парадак пераводу ў наступны клас, нормы ацэнкі вынікаў

вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах, модулях, умовы і парадак допуску навучэнцаў да выніковай атэстацыі пасля завяршэння навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых экзаменаў, прадастаўлення права праходжання выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін, парадак перагляду гадавой адзнакі, стварэння і функцыянавання экзаменацыйных камісій.

Атэстацыя асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пры засваенні зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі праводзіцца ў адпаведнасці з главой 60 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

59. У I і II класах адукацыйны працэс ажыццяўляецца ва ўмовах безадзнакавага навучання.

60. Выніковая атэстацыя праводзіцца па вучэбных прадметах, модулях па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе, навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

61. Навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, выдаецца пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай), навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, выдаецца атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асобага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём) у адпаведнасці з пунктамі 3, 4 артыкула 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

62. Пры выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы могуць узнагароджвацца пахвальнымі лістамі. Умовы ўзнагароджвання навучэнцаў пахвальнымі лістамі вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

Рашэнне аб узнагароджанні навучэнца пахвальным лістом прымаецца кіраўніком Установы адукацыі.

63. Навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, выдаецца пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі.

64. Навучэнцу, які не завяршыў засваенне зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, выдаецца даведка аб навучанні ў парадку, устаноўленым Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

65. Даведка аб навучанні выдаецца навучэнцам пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін.

Адукацыйныя адносіны спыняюцца датэрмінова:

па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца;

па ініцыятыве Установы адукацыі;

па абставінах, якія не залежаць ад волі навучэнца, Установы адукацыі.

Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін (адлічэнне) па ініцыятыве навучэнца, законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца ажыццяўляецца:

для пераводу ў іншую ўстанову адукацыі;

па асабістым жаданні.

66. Ва Установе адукацыі можа ажыццяўляцца выніковая атэстацыя ў парадку экстэрната згодна з заканадаўчымі актамі.

67. Выхаванне ажыццяўляецца на вучэбных занятках, занятках і ў працэсе выхаваўчай работы ў пазаўрочны час.

68. Мэтай выхавання з'яўляецца фарміраванне рознабакова развітай, маральна ўстойлівай, творчай асобы навучэнца.

69. Асноўнымі напрамкамі выхавання з'яўляюцца:

69.1. грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры;

69.2. ідэалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы, прывіццё падрастаючаму пакаленню асноўных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларускай дзяржаўнасці;

69.3. маральнае выхаванне, накіраванае на далучэнне навучэнцаў да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей;

69.4. эстэтычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў эстэтычнага густу, развіццё пачуцця прыгожага;

69.5. выхаванне культуры самапазнання і самарэгуляцыі асобы, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў патрэбы ў самаразвіцці і сацыяльным узаемадзеянні, псіхалагічнай культуры;

69.6. выхаванне культуры здаровага ладу жыцця, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў навыкаў здаровага ладу жыцця, усведамленне значнасці здароўя як каштоўнасці, фізічнае ўдасканаленне;

69.7. гендэрнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў уяўленняў аб ролі і жыццёвым прызначэнні мужчын і жанчын у сучасным грамадстве;

69.8. сямейнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да сям'і і выхавання дзяцей;

69.9. працоўнае і прафесійнае выхаванне, накіраванае на разуменне навучэнцамі працы як асабаснай і сацыяльнай каштоўнасці, усведамленне прафесійнага выбару, сацыяльнай значнасці прафесійнай дзейнасці;

69.10. экалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да прыроды;

69.11. выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў бяспечных паводзін у сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці, паўсядзённым жыцці;

69.12. выхаванне культуры побыту і вольнага часу, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да матэрыяльнага асяроддзя, умення эфектыўна выкарыстоўваць вольны час.

70. Выхаваўчая работа ў пазаўрочны час з навучэнцамі ажыццяўляецца педагагічнымі работнікамі, у тым ліку педагагічнымі работнікамі, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка.

71. Ва Установе адукацыі з мэтай сацыяльнай адаптацыі навучэнцаў і аптымізацыі адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі.

Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі ажыццяўляюцца педагогам-псіхолагам і (ці) педагогам сацыяльным у парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі.

## ГЛАВА 4
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

72. Установа адукацыі самастойная ў ажыццяўленні адукацыйнай, навуковай, навукова-тэхнічнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні Установы адукацыі, падборы і расстаноўцы кадраў і іншай дзейнасці ў межах, устаноўленых актамі заканадаўства.

73. Установа адукацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам мае права:

73.1. ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

73.2. фарміраваць структуру і штатны расклад Установы адукацыі;

73.3. ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы;

73.4. удзельнічаць у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі;

73.5. ажыццяўляць праверку сапраўднасці дакументаў аб адукацыі пры прыёме асоб для атрымання адукацыі і пры наяўнасці сумненняў у іх сапраўднасці шляхам накіравання запытаў у Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь аб пацвярджэнні факта іх выдачы;

73.6. уваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб'яднанняў некамерцыйных арганізацый;

73.7. ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі.

74. Установа адукацыі абавязана забяспечваць:

74.1. якасць адукацыі;

74.2. падбор, прыём на работу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

74.3. выкананне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

74.4. матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з устаноўленымі санітарнымі нормамі, правіламі і гігіенічнымі нарматывамі;

74.5. стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

74.6. распрацоўку і прыняцце правіл унутранага распарадку для навучэнцаў, правіл унутранага працоўнага распарадку Установы адукацыі;

74.7. маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы адукацыі;

74.8. меры сацыяльнай абароны навучэнцаў;

74.9. стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання і аказання медыцынскай дапамогі навучэнцам;

74.10. патранат асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на працягу двух гадоў пасля атрымання адукацыі ў дадзенай Установе адукацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб патранаце асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

74.11. удзел у фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму;

74.12. садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

75. Установа адукацыі нясе адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 5
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

76. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу ва Установе адукацыі з'яўляюцца навучэнцы, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі.

77. Навучэнцы ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства маюць права на:

77.1. атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

77.2. атрыманне бясплатнай агульнай базавай, агульнай сярэдняй адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

77.3. атрыманне платных паслуг у сферы адукацыі;

77.4. навучанне па індывідуальным вучэбным плане ў межах зместу адукацыйнай праграмы;

77.5. перавод у іншую ўстанову адукацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

77.6. ахову жыцця і здароўя ў час адукацыйнага працэсу;

77.7. карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь;

77.8. канікулы;

77.9. бясплатнае карыстанне бібліятэкай, вучэбнай, вытворчай, навуковай і культурна-спартыўнай базай Установы адукацыі;

77.10. атрыманне сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў Установы адукацыі;

77.11. стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця;

77.12. заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах; удзел у кіраванні Установай адукацыі;

77.13. удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях і іншых адукацыйных мерапрыемствах, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі;

77.14. удзел у маладзёжных і іншых грамадскіх аб’яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

77.15. прававую і сацыяльную абароненасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам;

77.16. своечасовае атрыманне інфармацыі аб ацэнцы вынікаў вучэбнай дзейнасці, тэрмінах правядзення атэстацыі;

77.17. атрыманне харчавання ва Установе адукацыі ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь;

77.18. наведванне мерапрыемстваў, якія арганізуюцца Установай адукацыі для вучняў, з улікам іх узросту;

77.19. азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчымі дакументамі, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

77.20. зварот у камісію па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка ў выпадку ўзнікнення супярэчнасцей паміж удзельнікамі адукацыйных адносін.

78. Навучэнцы абавязаны:

78.1. добрасумленна і адказна ставіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;

78.2. клапаціцца аб сваім здароўі, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця, самаўдасканалення;

78.3. выконваць патрабаванні ўстаноўчых дакументаў, правілаў унутранага распарадку для навучэнцаў;

78.4. беражліва ставіцца да маёмасці Установы адукацыі;

78.5. высока несці гонар навучэнца Установы адукацыі, імкнуцца павышаць яе прэстыж, захоўваць і памнажаць традыцыі, якія склаліся ва Установе адукацыі;

78.6. павышаць свой адукацыйны ўзровень на вучэбных і факультатыўных занятках;

78.7. рэгулярна наведваць вучэбныя заняткі, прадстаўляць класнаму кіраўніку звесткі аб прычынах пропускаў вучэбных заняткаў;

78.8. удзельнічаць у грамадска карыснай працы;

78.9. пастаянна працаваць над самаразвіццём і самаадукацыяй, павышаць свой культурны ўзровень;

78.10. паважаць гонар і годнасць іншых людзей, паважаць іх погляды і перакананні, з павагай ставіцца да нацыянальнай гісторыі, культуры свайго і іншых народаў;

78.11. годна паводзіць сябе ва Установе адукацыі і за яе межамі, праяўляць павагу да старэйшых і равеснікаў, міласэрнасць і чалавечнасць;

78.12. падтрымліваць грамадскі парадак, не выкарыстоўваць асабістыя сродкі сувязі падчас вучэбных заняткаў і мерапрыемстваў, за выключэннем вучэбных момантаў, якія дазволены дакументальна;

78.13. ведаць і выконваць правілы дарожнага руху, пажарнай бяспекі, паводзін на вадзе і іншыя правілы бяспекі жыццядзейнасці;

78.14. не дапускаць прычынення шкоды здароўю іншых асоб;

78.15. наведваць Установу адукацыі ў вучэбны час у адзенні дзелавога стылю;

78.16. падпарадкоўвацца загадам дырэктара і яго намеснікаў, патрабаванням педагагічных работнікаў і іншых работнікаў Установы адукацыі, органам вучнёўскага самакіравання.

79. Законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх навучэнцаў з’яўляюцца іх бацькі, усынавіцелі (удачарыцелі), апекуны, папячыцелі.

80. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства маюць права на:

80.1. азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчымі дакументамі, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатам аб дзяржаўнай акрэдытацыі, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

80.2. удзел у кіраванні Установай адукацыі;

80.3. абарону правоў і законных інтарэсаў навучэнцаў, уключаючы зварот у камісію па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педагагічнага

работніка ў выпадку ўзнікнення супярэчнасцей паміж удзельнікамі адукацыйных адносін;

80.4. азнаямленне з ходам і зместам адукацыйнага працэсу, метадамі навучання і выхавання, вынікамі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у парадку, які вызначаецца кіраўніком Установы адукацыі з удзелам органа самакіравання, у які ўваходзяць асобы з ліку законых прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў;

80.5. атрыманне інфармацыі аб усіх відах абследаванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў.

81. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў абавязаны:

81.1. забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця дзіцяці;

81.2. паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

81.3. выконваць патрабаванні ўстаноўчых дакументаў, правілаў унутранага распарадку для навучэнцаў;

81.4. супрацоўнічаць з Установай адукацыі па пытаннях адукацыі дзіцяці;

81.5. несці адказнасць за выхаванне свайго дзіцяці перад Установай адукацыі;

81.6.прывіваць дзецям патрэбнасць у працоўным, фізічным, эстэтычным развіцці і маральным удасканаленні; выхоўваць гуманістычныя ідэалы, дабрыню, валявыя якасці, развіваць высокія культурна-эстэтычныя патрэбнасці і мастацкі густ;

81.7. пастаянна клапаціцца аб фізічным і псіхічным здароўі дзяцей, прывіваць ім санітарна-гігіенічныя навыкі, далучаць да здаровага ладу жыцця;

81.8. паважліва ставіцца да Установы адукацыі, іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу, клапаціцца аб падтрыманні іх аўтарытэту;

81.9. несці матэрыяльную адказнасць за прычыненне ўрону, нанесенага Установе адукацыі іх дзецьмі;

81.10. кантраляваць бягучую і выніковую паспяховасць дзіцяці, выкананне ім дамашніх заданняў;

81.11. паказваць дзецям станоўчы прыклад сваіх адносін да работы, паводзін у побыце, узаемаадносін мужа і жонкі, клапаціцца аб прыкладным духоўна-псіхалагічным клімаце ў сваёй сям’і;

81.12. паважаць, падтрымліваць і развіваць культурныя традыцыі Установы адукацыі.

82. Педагагічныя работнікі маюць права на:

82.1. абарону прафесійнага гонару і годнасці;

82.2. забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

82.3. удзел у кіраванні Установай адукацыі;

82.4. аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

82.5. творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных форм і метадаў навучання і выхавання, вучэбных выданняў і сродкаў навучання;

82.6. павышэнне кваліфікацыі;

82.7. маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

82.8. штомесячную кампенсацыю расходаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі;

82.9. бясплатную перавозку да месца работы і назад школьным аўтобусам па маршруце яго руху ў выпадку адсутнасці рэгулярных аўтамабільных перавозак пасажыраў транспартам агульнага карыстання, якія забяспечваюць прыбыццё педагагічнага работніка да пачатку яго рабочага дня да месца работы і назад, і пры наяўнасці свабодных пасадачных месцаў у школьным аўтобусе.

82. Педагагічныя работнікі абавязаны:

83.1. ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм, праграм выхавання;

83.2. выконваць прававыя, маральныя і этычныя нормы;

83.3. паважаць гонар і годнасць навучэнцаў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

83.4. павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

83.5. весці здаровы лад жыцця, прапагандаваць яго сярод навучэнцаў;

83.6. праходзіць папярэдні медыцынскі агляд (пры паступленні на работу) і перыядычныя медыцынскія агляды ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны;

83.7. ажыццяўляць педагагічную дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, Статутам і іншымі лакальнымі нарматыўнымі дакументамі, выконваць умовы працоўнага дагавора (кантракта), загады (распараджэнні) кіраўніцтва, рашэнні, прынятыя органамі самакіравання Установы адукацыі, якія не супярэчаць заканадаўству;

83.8. добрасумленна працаваць, выконваць працоўную дысцыпліну;

83.9. якасна і ў поўным аб'ёме выконваць вучэбны план, патрабаванні адукацыйных стандартаў і адукацыйных праграм, забяспечваць належны ўзровень адукацыі навучэнцаў, развіваць іх пазнавальныя інтарэсы і здольнасці;

83.10. фарміраваць навуковы светапогляд, гуманістычныя, высокамаральныя, грамадзянскія ідэалы навучэнцаў;

83.11. сацыялізаваць навучэнцаў, дапамагаць іх самасцвярджэнню.

84. Педагагічныя работнікі не могуць аказваць платныя кансультатыўныя паслугі па асобных вучэбных прадметах, модулях, тэмах, у тым ліку дапамогу ў падрыхтоўцы да ўступных іспытаў (рэпетытарства), навучэнцам, калі гэта прыводзіць да канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

85. Педагагічным работнікам забараняецца выкарыстоўваць адукацыйны працэс у палітычных мэтах ці для пабуджэння навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заканадаўству.

## ГЛАВА 6
## ПАРАДАК КІРАВАННЯ ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

86. Кіраванне Установай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, Статутам Установы адукацыі і будуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання.

87. Установу адукацыі ўзначальвае кіраўнік (дырэктар), які ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва адукацыйным працэсам і бягучай дзейнасцю Установы адукацыі. Дырэктар мае намеснікаў па вучэбнай і выхаваўчай рабоце. Дырэктар назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады ўпраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта. Дырэктар па ўзгадненні з упраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта назначае і вызваляе ад пасады намеснікаў.

88. Дырэктар Установы адукацыі:

88.1. кіруе ўсімі напрамкамі дзейнасці Установы адукацыі;

88.2. арганізуе дзейнасць Установы адукацыі ў адпаведнасці з дадзеным Статутам і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

88.3. дзейнічае ад імя Установы адукацыі, прадстаўляе яе ва ўсіх інстанцыях без даверанасці, валодае правам першага подпісу фінансавых дакументаў;

88.4. кантралюе ход рэалізацыі асноўных накірункаў развіцця Установы адукацыі;

88.5. зацвярджае палажэнні, якія рэгламентуюць дзейнасць Установы адукацыі, і іншыя лакальныя дакументы ў адпаведнасці з дадзеным Статутам і заканадаўчымі актамі;

88.6. зацвярджае структуру і штатны расклад у межах устаноўленай колькасці і расходаў на ўтрыманне;

88.7. выдае загады, дае распараджэнні, абавязковыя для ўсіх работнікаў, нясе поўную адказнасць за вынікі дзейнасці Установы адукацыі;

88.8. ажыццяўляе залічэнне, перавод і адлічэнне навучэнцаў Установы адукацыі;

88.9. нясе адказнасць за правільнасць падліку сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі;

88.10. ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў, зацвярджае іх службовыя і рабочыя інструкцыі;

88.11. стварае ўмовы для творчай дзейнасці навучэнцаў і педагагічных работнікаў, прымянення імі перадавых формаў і метадаў навучання і выхавання;

88.12. выносіць найбольш важныя пытанні жыццядзейнасці Установы адукацыі на разгляд педагагічнага савета;

88.13. праяўляе клопат аб маральнай і сацыяльнай абароне работнікаў і навучэнцаў;

88.14. выконвае, кантралюе выкананне рашэнняў, прынятых педагагічным саветам, вышэйстаячымі органамі;

88.15. заключае дагаворы па аказанні Установай адукацыі паслуг навучэнцам і іх законным прадстаўнікам;

88.16. у адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючага заканадаўства, заключае дагаворы з арганізацыямі, прадпрыемствамі і асобамі на выкананне розных відаў будаўніча-мантажных работ па бягучым рамонце Установы адукацыі, афармленні і гаспадарчым утрыманні яе памяшканняў, збудаванняў;

88.17. мае права дэлегаваць частку сваіх паўнамоцтваў падначаленым.

89. Службовыя абавязкі кіраўніка Установы адукацыі зацвярджае ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта.

90. Кіраўнік Установы адукацыі ў дзейнасці па кіраванні ўстановай узаемадзейнічае з органамі самакіравання Установы адукацыі.

91. Асноўным органам самакіравання ва Установе адукацыі з'яўляецца педагагічны савет, які ўзначальвае кіраўнік Установы адукацыі.

92. Да кампетэнцыі педагагічнага савета адносяцца:

92.1. удзел у кіраванні Установай адукацыі;

92.2. вызначэнне прыярытэтных напрамкаў дзейнасці;

92.3. удасканальванне якасці агульнай сярэдняй адукацыі;

92.4. распрацоўка механізмаў удасканальвання здароўезберагальнага адукацыйнага асяроддзя;

92.5. укараненне ў адукацыйны працэс эфектыўных сучасных адукацыйных тэхналогій і методык навучання і выхавання;

92.6. правядзенне работы па ўдасканальванні прафесійных кампетэнцый педагагічных работнікаў і развіцці іх ініцыятывы і творчасці.

93. Парадак дзейнасці педагагічнага савета Установы адукацыі вызначаецца Палажэннем аб педагагічным савеце, дадзеным Статутам і лакальнымі актамі Установы адукацыі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

94. Педагагічны савет з'яўляецца калегіяльным органам і ажыццяўляе сваю работу ў форме пасяджэнняў, якія склікаюцца не радзей за адзін раз у чвэрць у адпаведнасці з планам работы ці па меры неабходнасці для рашэння пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі педагагічнага савета. На пасяджэннях педагагічнага савета вядзецца пратакол у поўнай форме.

95. Рашэнні педагагічнага савета прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў пры наяўнасці на пасяджэнні педагагічнага савета не менш за дзве трэці яго членаў. Пры роўнай колькасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас старшыні.

Рашэнні педагагічнага савета з'яўляюцца абавязковымі для выканання ўсімі педагагічнымі работнікамі і навучэнцамі Установы адукацыі (законнымі прадстаўнікамі непаўналетных навучэнцаў).

96. З мэтай аказання садзейнічання ў забеспячэнні дзейнасці і развіцця Установы адукацыі можа быць створаны метадычны савет, бацькоўскі камітэт, вучнёўскі савет, папячыцельскі савет, які з'яўляецца органам самакіравання і ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб папячыцельскім савеце, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Статутам Установы адукацыі.

97. Рашэнне аб стварэнні папячыцельскага савета прымаецца ініцыятыўнай групай, у склад якой могуць уваходзіць законныя прадстаўнікі навучэнцаў, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі іншых арганізацый, іншыя асобы.

98. Рашэнне аб уключэнні ў склад папячыцельскага савета прымаецца агульным сходам папячыцельскага савета.

99. Вышэйшым органам кіравання папячыцельскім саветам з'яўляецца агульны сход. Узначальвае агульны сход папячыцельскага савета старшыня папячыцельскага савета, які выбіраецца на 3 гады.

100. Парадак дзейнасці папячыцельскага савета:

100.1. агульны сход праводзіцца не радзей за адзін раз у паўгоддзе і афармляецца пратаколам, які падпісваеца старшынёй і сакратаром;

100.2. рашэнні па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі агульнага сходу, прымаюцца большасцю (не менш за дзве трэці) галасоў прысутных членаў папячыцельскага савета.

101. Фінансавыя сродкі папячыцельскага савета фарміруюцца з добраахвотных узносаў і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, якія залічваюцца на разліковы рахунак па ўліку пазабюджэтных сродкаў Установы адукацыі, і выкарыстоўваюцца па мэтавым прызначэнні ў адпаведнасці з рашэннем папячыцельскага савета.

102. З мэтай вырашэння задач Установы адукацыі, удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу, паспяховай рэалізацыі зместу адукацыйных праграм і павышэння якасці адукацыі ва Установе адукацыі могуць ствараецца метадычныя аб'яднанні, савет па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, іншыя органы самакіравання, дзейнасць якіх рэгламентуецца палажэннямі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

103. З мэтай забеспячэння правоў навучэнцаў ва ўпраўленні Установай адукацыі могуць ствараецца і дзейнічаць органы вучнёўскага самакіравання.

Установа адукацыі прызнае прадстаўнікоў органаў вучнёўскага самакіравання, прадстаўляе ім неабходную інфармацыю.

104. Прафесійныя саюзы, якія дзейнічаюць ва Установе адукацыі, удзельнічаюць у кіраванні Установай адукацыі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, лакальнымі актамі Установы адукацыі.

## ГЛАВА 7
## ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ СТРУКТУРЫ І ШТАТНАГА РАСКЛАДУ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

105. Установа адукацыі фарміруе сваю структуру ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

106. У структуру Установы ўваходзяць майстэрня, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

107. Працоўныя адносіны работнікаў ва Установе адукацыі рэгулююцца працоўнымі дагаворамі, кантрактамі, якія заключаюцца ў адпаведнасці з працоўным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Калектыўным дагаворам, правіламі ўнутранага працоўнага распарадку.

108. Штатны расклад Установы адукацыі зацвярджаецца кіраўніком па ўзгадненні з упраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта на падставе тыпавых штатных

нарматываў, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, у межах сродкаў, якія выдзелены на аплату працы.

109. Прыём на работу і звальненне педагагічных работнікаў ажыццяўляе кіраўнік Установы адукацыі па ўзгадненні з упраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Клецкага раённага выканаўчага камітэта, іншых работнікаў – кіраўнік.

110. На педагагічную работу прымаюцца работнікі, якія маюць неабходную педагагічную адукацыю ці спецыяльную адукацыю пры ўмове праходжання імі інтэграваных курсаў псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі, з прадастаўленнем адпаведных пацвярджаючых дакументаў.

Кваліфікацыйныя патрабаванні да педагагічных работнікаў вызначаюцца адпаведнымі кваліфікацыйнымі характарыстыкамі.

111. Педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы:

111.1. пазбаўленыя права займацца педагагічнай дзейнасцю;

111.2. якія маюць судзімасць, якая не знята ці не пагашана;

111.3. прызнаныя недзеяздольнымі і абмежавана дзеяздольнымі;

111.4. якія не маюць права займацца педагагічнай дзейнасцю ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі;

111.5. якія маюць медыцынскія супрацьпаказанні да ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці.

112. Пры ўзнікненні ў перыяд ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці абставін, якія перашкаджаюць яе ажыццяўленню і прадугледжаны пунктам 111 Статута, ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці спыняецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## ГЛАВА 8
## КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЁМАСЦІ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ І ЯГО ФІНАНСАВАННЕ

113. Маёмасць, перададзеная Установе адукацыі, знаходзіцца ва ўласнасці Клецкага раёна і належыць Установе адукацыі на правах бязвыплатнага карыстання.

Валоданне, карыстанне і распараджэнне гэтай маёмасцю Установа адукацыі ажыццяўляе ў межах, якія вызначаюцца заканадаўствам.

114. Установа адукацыі валодае, карыстаецца і распараджаецца замацаванай за ёй маёмасцю ў адпаведнасці з яе назначэннем і сваімі статутнымі мэтамі, заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

115. Установа адукацыі нясе адказнасць за цэласнасць і эфектыўнае выкарыстанне замацаванай за маёмасці.

116. Матэрыяльна-тэхнічная база Установы адукацыі ўключае будынкі, збудаванні, зямельныя ўчасткі, камунікацыі, інвентар, абсталяванне іншае.

117. Установа адукацыі не мае права без згоды ўласніка адчужаць ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ёй маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, выдзеленых ёй па каштарысе.

118. Матэрыяльна-тэхнічная база Установы адукацыі фарміруецца па дзеючых нарматывах, з улікам забеспячэння атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, тыпу ўстановы адукацыі і формаў навучання.

119. Фінансаванне Установы адукацыі ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту на аснове дзяржаўных і мясцовых нарматываў фінансавання, вызначаных з разліку на аднаго навучэнца для дадзенага тыпу і віду ўстановы адукацыі.

Прыцягненне Установай адукацыі дадатковых сродкаў не зніжае нарматываў і памераў яе фінансавання з бюджэту.

120. Дадатковымі крыніцамі фінансавання Установы адукацыі з'яўляюцца:

120.1. даходы, атрыманыя ад рэалізацыі прадукцыі, выканання работ і аказання паслуг;

120.2. добраахвотныя пералічэнні фізічных асоб, у тым ліку навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў;

120.3. іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

121. Установа адукацыі можа ажыццяўляць платную адукацыйную дзейнасць па аказанні дадатковых адукацыйных паслуг, якія не фінансуюцца з бюджэту.

Кошт дадатковых адукацыйных паслуг вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь з улікам эканамічна абгрунтаваных затрат.

122. Грашовыя сродкі, атрыманыя ў выніку ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку аказання платных паслуг, паступаюць у самастойнае распараджэнне Установы адукацыі, улічваюцца і расходуюцца па каштарысах, зацверджаных у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

123. Умацаванне, абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы адукацыі ажыццяўляецца за кошт бюджэтных сродкаў, а таксама сродкаў, атрыманых у выніку аказання платных паслуг, рэалізацыі прадукцыі і паслуг насельніцтву, добраахвотных пералічэнняў арганізацый, фізічных і юрыдычных асоб, іншых відаў дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

# ГЛАВА 9
# УЛІК, СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ І ПАРАДАК КАНТРОЛЮ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

124. Дакументацыя Установы адукацыі вядзецца ў адпаведнасці з парадкам, зацверджаным дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

125. Установа адукацыі ажыццяўляе ўлік вынікаў сваёй дзейнасці, прадстаўляе статыстычную і іншую справаздачнасць ва ўстаноўленым парадку, а таксама аператыўную інфармацыю аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці заснавальніку.

За непрадстаўленне і (або) скажэнне справаздачнасці, парушэнне тэрмінаў яе прадстаўлення службовыя асобы Установы адукацыі нясуць устаноўленую заканадаўствам адказнасць.

126. Кантроль за дзейнасцю Установы адукацыі ажыццяўляецца заснавальнікам і ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі.

Рэвізія (праверка) фінансава-гаспадарчай дзейнасці Установы адукацыі праводзіцца дзяржаўнымі кантралюючымі органамі, упаўнаважанымі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь здзяйсняць рэвізіі (праверкі) фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асоб.

Дзяржаўныя органы, упаўнаважаныя ажыццяўляць кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі, ажыццяўляюць дзейнасць па праверцы адпаведнасці адукацыі адукацыйнаму стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, адукацыйнай дзейнасці, патрабаванням заканадаўства.

127. Установа адукацыі ажыццяўляе самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі (комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку, самаацэнку адукацыйнай дзейнасці). Парадак і перыядычнасць правядзення самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі вызначаюцца дырэктарам Установы адукацыі.

128. Установа адукацыі абавязана пацвярджаць дзяржаўную акрэдытацыю ў парадку, устаноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

# ГЛАВА 10
# МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

129. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай павагі і не павінна наносіць шкоды суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспецы і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

## ГЛАВА 11
## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

130. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы адукацыі, праходжанне атэстацыі і дзяржаўнай акрэдытацыі ажыццяўляецца ў парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

131. Рэарганізацыя ці ліквідацыя Установы адукацыі ажыццяўляецца, як правіла, па заканчэнні навучальнага года згодна з рашэннем Клецкага раённага выканаўчага камітэта. Заснавальнік забяспечвае перавод навучэнцаў у іншыя ўстановы у парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам.

МИНСКИЙ ОБЛИСПОЛКОМ
КЛЕЦКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 690332545
19.06.2023
дата подпись
Дашкевич Е.В.
фамилия, инициалы

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Клецкага раённага
выканаўчага камітэта
12.06.2023 № 876

Змены ў Статут
Дзяржаўнай установы адукацыі "Сіняўская сярэдняя школа Клецкага раёна", зарэгістраванага Клецкім раённым выканаўчым камітэтам 10 лістапада 2022 г., у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 690332545

Пункт 5 Главы 1 "Агульныя палажэнні" выкласці ў наступнай рэдакцыі":

"5. Установа адукацыі ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб парадку правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць і пацвярджэння дзяржаўнай акрэдытацыі, іншымі актамі заканадаўства, дадзеным Статутам і грунтуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання.

Установа адукацыі з'яўляецца дзяржаўнай установай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі і можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў, модуляў на павышаным узроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, вывучэнне вучэбных прадметаў, модуляў на павышанным ўзроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Сярэдняя школа таксама можа рэалізоўваць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю."

Пункт 47 Главы 3 "Арганізацыя адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі" выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"47. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў класах, у тым ліку і класах інтэграванага навучання і выхавання, і індывідуальна.

Класы інтэграванага навучання і выхавання – класы, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, засвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, і асобы, якія не маюць такіх асаблівасцяў і засвойваюць змест адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

Парадак стварэння спецыяльных класаў, класаў інтэграванага навучання і выхавання і арганізацыі адукацыйнага працэсу ў іх вызначаецца Міністэрствам адукацыі.

Прыём (залічэнне) асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця для засваення зместу адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца на падставе заключэння дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі ў парадку, устаноўленым для прыёму (залічэння) асоб для засваення зместу адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі".

Пункт 60 Главы 3 "Арганізацыя навучальнага працэсу ва ўстанове адукацыі" выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"60. Выніковая атэстацыя праводзіцца па вучэбных прадметах, модулях па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе, навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

60.1. Выніковая атэстацыя па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе праводзіцца па выніках прамежкавай атэстацыі.

60.2. Выніковая атэстацыя па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі праводзіцца па выніках выніковай атэстацыі па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе і выніковых выпрабаванняў па асобных вучэбных прадметах, модулях.

60.3. Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя выпрабаванні па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды, формы і тэрміны правядзення выніковых выпрабаванняў штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

60.4. Выніковая атэстацыя па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі праводзіцца па выніках выніковай атэстацыі па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе і выніковых выпрабаванняў па асобных вучэбных прадметах, модулях. Выніковыя выпрабаванні па асобных вучэбных прадметах могуць праводзіцца ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену.

60.5. Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя выпрабаванні па завяршэнні навучання і выхавання на III

ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды, формы і тэрміны правядзення выніковых выпрабаванняў, у тым ліку асноўны і іншы тэрміны, рэзервовыя дні правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

60.6. Навучэнцы праходзяць выніковыя выпрабаванні ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену ва ўстановах агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, іншых установах адукацыі, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі ў якасці пунктаў правядзення цэнтралізаваных экзаменаў.

60.7. Парадак арганізацыі і правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, у тым ліку ўстановы адукацыі, якія вызначаюцца ў якасці пунктаў правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, і ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, якія замацоўваюцца за такімі пунктамі, вызначаюцца Міністэрствам адукацыі.

60.8. Навучэнцы па медыцынскіх падставах могуць быць вызваленыя ад выніковых выпрабаванняў па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Пералік захворванняў, якія з'яўляюцца медыцынскай падставай для вызвалення навучэнцаў ад выніковых выпрабаванняў па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

60.9. Навучэнцы могуць быць вызваленыя ад выніковых выпрабаванняў па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі па іншых падставах. Іншыя падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых выпрабаванняў устанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

60.10. Парадак правядзення выніковай атэстацыі навучэнцаў, вызваленых ад выніковых выпрабаванняў, вызначаецца правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі.

60.11. Навучэнцам, якія маюць станоўчыя вынікі выніковай атэстацыі па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе, якія не згодныя з гадавой адзнакай, прадастаўляецца права на перагляд гэтай гадавой адзнакі, але не больш чым па двух вучэбных прадметах, модулях.

60.12. Выніковая атэстацыя па вучэбных прадметах, модулях, па якіх праводзяцца выніковыя выпрабаванні па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, ажыццяўляецца экзаменацыйнымі камісіямі, іншымі камісіямі, якія ўдзельнічаюць у правядзенні выніковай атэстацыі.

60.13. Віды выніковай атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, парадак пераводу ў наступны клас, нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па

вучэбных прадметах, модулях, умовы і парадак допуску вучняў да выніковай атэстацыі па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, падставы для вызвалення навучэнцаў ад выніковых выпрабаванняў, прадастаўлення права праходжання выніковай атэстацыі ў іншы тэрмін, парадак перагляду гадавой адзнакі, стварэння і функцыянавання, парадак правядзення выніковай атэстацыі ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, вызначаюцца Правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі".

60.14. Вынікі выніковай атэстацыі навучэнцаў заносяцца ў пратакол выніковага выпрабавання, класны журнал, дзённік навучэнца і асабовую картку навучэнца. Тыпавыя формы пратакола выніковага выпрабавання, асабовую картку навучэнца і парадак іх запаўнення (вядзення) вызначаюцца Міністэрствам адукацыі".